Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 САКАВІКА 2024 г. ЧАЦВЕР № 52 (30186)

ЯК ЗМЯНЯЎСЯ АСНОЎНЫ ЗАКОН БЕЛАРУСАЎ 4–5

ДЗЯЎЧЫНА-АЛЬБІНОС ПРА ПРЫНЯЦЦЕ СЯБЕ ЧЫРВОНКА

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына ВАРАНОВІЧ, дырэктар дэпартамента па турызме Мінспорту:

«Беларусы адкрываюць для сябе тыя куточкі краіны, пра якія ніколі не задумваліся. Нашы вобласці працуюць у гэтым кірунку. Мы расказваем пра пілотныя праекты. Кожны рэгіён абраў для сябе нейкую «фішку», разыначку для таго, каб да іх прыязджалі. Назіраецца пэўная тэндэнцыя — людзі аддаюць перавагу падарожжам у кампаніі, з сям'ёй на асабістым аўтамабілі ці іншым транспарце, пры гэтым самастойна будуюць маршрут».

Вашы лісты — у надзейных руках!

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Нягледзячы на шырокае ўжыванне сродкаў аўтаматызацыі ў РУП «Белпошта», без удзелу чалавека не абысціся. Аператар сувязі Святлана ЛУФЕРЧЫК больш за дзесяць гадоў працуе ў цэху па апрацоўцы пошты і экспедаванні друку вытворчасці «Мінская пошта». Яе абавязкі — работа з пісьмасартавальнай машынай і апрацоўка карэспандэнцыі. І менавіта ад якасці гэтай работы залежыць, як хутка ваша пісьмо ці паштоўка дойдзе да адрасата.

КАРАТКА

- **Указам Прэзідэнта Беларусі скарэкціраваны пытанні адчужэння маёмасці асоб з недружалюбных краін.**
- Мінсувязі выпусціла ў абарачэнне паштовую марку «Са святам Вялікадня!»
- **У Беларусі стварылі дзяржкамісію па выбары пляцоўкі для захавання радыеактыўных адходаў.**
- У мінчан з'явілася магчымасць у Telegram інфармаваць ДАІ аб транспарце, які не эксплуатуецца.
- **Беларусь увайшла ў топ-8 зборных сусветнага пляжнага футбола.**
- БрДТУ летам пачне набор па спецыяльнасці «Вытворчасць вырабаў на аснове трохмерных тэхналогій».
- **«МАЗ-Купава» рыхтуе да выпуску фуд-трак для грамадскага харчавання.**

Памяць жыве

ХОР, ЯКІ СТВАРЫЎ ПРАХОР

Таццяна Глебік расказвае выхаванцам Навасельскага дзіцячага садка пра свайго славутага дзядулю. У руках жанчына трымае той самы фотаздымак Прахора Васілеўскага, які вісеў на сцяне ў хаце яе бабулі.

Хадзіў па вёсках і слухаў, як спяваюць простыя жанчыны

Пра стваральніка славутага Казловіцкага хору Прахора (менавіта так яго называлі) Васілеўскага я даведалася зусім выпадкова. Падчас адной з камандзіровак разгаварылася з музычным кіраўніком Навасельскага дзіцячага садка. Тады мяне ўразіла, з якой цеплынёй і гонарам Таццяна Глебік расказвала пра свайго стрыечнага дзядулю, якога нават ніколі не бачыла...

ФОТАЗДЫМАК — У СПАДЧЫНУ

— Вось гэты фотаздымак Прахора Мартынавіча заўсёды вісеў у хаце маёй бабулі, яго сястры Ганны, — паказвае і расказвае Таццяна ГЛЕБІК. — І я з дзяцінства памятаю, як яна шораз, гледзячы на яго, згадвала брата, паўтарала «Мой Прахорык, мой Прахорык».

СТАР. 12

Прыродны дар

І АХОВА, І ДЫЗАЙН...

У Гродне прапаноўваюць зрабіць тыпавы праект для ўсіх крыніц — помнікаў прыроды

Пробны эскіз нядаўна паступіў на разгляд мясцовых органаў улады і землекарыстальніка. Мяркуецца, што ўсе шэсць крыніц будуць вызначаны на мясцовасці па тыпавым плане, але кожная з асаблівымі элементамі. Работы плануецца пачаць сёлета, а на другі год рэалізацыя праектаў пройдзе ў адпаведнасці з выдзяленнем бюджэтных сродкаў. Днямі экспертная група з карэспандэнтам «Звязды» пабывала на самых папулярных крыніцах.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2024 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

ISSN 1990 — 763X

З нагоды

«СВАЁЙ ВУЧОБАЙ, СВАІМІ ДАСЯГНЕННЯМІ ВЫ ЎНОСІЦЕ ЎКЛАД У БУДУЧЫНЮ НАШАЙ КРАІНЫ»

Наталля КАЧАНАВА ўручыла пашпарты грамадзяніна Рэспублікі Беларусь

Урачыстая цырымонія адбылася ў рамках Усебеларускай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!», прысвечанай Дню Канстытуцыі. Патрыятычная ініцыятыва, калі юныя беларусы атрымліваюць галоўны дакумент з рук заслужаных людзей краіны, стала ўжо добрай традыцыяй. Спікер верхняй палаты парламента ўручыла пашпарты хлопцам і дзяўчатам, якія дасягнулі поспехаў у вучобе, спорце, творчасці і грамадскай дзейнасці. Юныя беларусы прыехалі ў Савет Рэспублікі з розных рэгіёнаў краіны.

Фота БелТА.

Наталля Качанава павіншавала маладых людзей са знакавай падзеяй у іх жыцці і нагадала, што сёлета Усебеларуская акцыя прымеркавана да 30-годдзя Асноўнага Закона краіны. Старшыня Савета Рэспублікі спынілася на маштабнай рабоце парламентарыяў па прывядзенні беларускага заканадаўства ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй.

Як звярнула ўвагу спікер верхняй палаты парламента, на падставе гэтага дакумента, які вызначае кірункі нашага развіцця, дзяржаўны лад Беларусі, распрацоўваюцца законы. «Усе яны павінны адпавядаць Канстытуцыі, бо там вызначаны асноўныя кірункі, роўна як і абавязкі кожнага грамадзяніна, раскрываюцца ўзаемаадносіны паміж дзяржавай, грамадствам і асобай, грамадзянінам, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Таму для нас была вельмі важная работа над Асноўным Законам нашай краіны».

Члены Савета Рэспублікі ўнеслі звыш ста прапаноў, якія ў далейшым разглядаліся ў кантэксце работы над Канстытуцыяй. Адна з іх датычылася падтрымкі моладзі. Так, у Асноўным Законе з'явіўся асобны артыкул, які сведчыць, што дзяржава садзейнічае духоўнаму, маральнаму, інтэлектуальнаму і фізічнаму развіццю моладзі, стварае неабходныя ўмовы для яе свабоднага і эфектыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, рэалізацыі патэнцыялу моладзі ў інтарэсах усяго грамадства.

Кажучы аб заканадаўчай дзейнасці, Наталля Качанава адзначыла, што парламентарыі робяць усё дзеля таго, каб наша краіна развівалася так, як развіваецца сёння. «Мы ўсе з вамі разумеем, у якой цудоўнай краіне жывём: прыгожай, дагледжанай, уладкаванай, — падкрэсліла спікер. — І ўсё дзякуючы людзям, якія стваралі даброты. 30-годдзе Асноўнага Закона краіны з'яўляецца важнай падзеяй у гісторыі, якую адзначаюць усе беларусы і ганарацца тым, што жывуць у свабоднай, суверэннай і незалежнай краіне. І мы вельмі спадзяёмся на тое, што гэтыя слаўныя добрыя традыцыі будзеце працягваць вы».

Звяртаючыся да хлопцаў і дзяўчат, Старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што яны — тыя, хто сваёй працай дасягнуў пэўных вынікаў. «Вы сёння працуеце на сваю будучыню і будучыню нашай краіны, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Ужо сёння сваёй вучобай, сваімі дасягненнямі вы ўносіце ўклад у будучыню нашай краіны».

Спікер нагадала, што сёлета беларусы адзначаюць 80-годдзе вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і падкрэсліла, што ў беларускага народа слаўная гісторыя, якая напоўнена як трагічнымі момантамі, так і гераічнымі ўчынкамі. «Мы ўпэўнены, што вы будзеце працягваць традыцыі, што закладзены вашымі прадзедамі, дзядамі, бацькамі, — заўважыла Старшыня Савета Рэспублікі. — Няважна, чым вы будзеце займацца. Важна, каб вы былі сапраўднымі патрыётамі сваёй краіны, якія бязмерна любяць сваю малую радзіму, краіну ў цэлым».

Наталля Качанава адзначыла, што маладыя людзі, якія атрымалі пашпарты грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, павінны ганарыцца гэтым. «Памятайце, што вы патрэбны сваёй краіне, свайму народу, вы павінны рабіць усё дзеля таго, каб наша краіна заставалася свабоднай, суверэннай і незалежнай, — звярнула ўвагу яна. — Ад вас у многім гэта залежыць».

Пасля ўрачыстай цырымоніі ўручэння пашпартоў адбыўся дыялог Старшыні Савета Рэспублікі і маладых людзей. Хлопцы і дзяўчаты задалі спікеру пытанні, якія іх цікавяць. Гаварылі пра любоў да малой радзімы, у цэлым да краіны, пра важнасць школьнага навучання, якасць ва ўсіх сферах жыццядзейнасці. Закранулі і найбольш вострыя праблемы ў маладзёжным асяроддзі.

У размове з журналістамі Наталля Качанава назвала ўручэнне пашпартоў грамадзяніна Рэспублікі Беларусь адной з самых добрых традыцый у нашай краіне. «Мы ўручаем пашпарты тым хлопцам і дзяўчатам, якія ўступаюць у паўнавартаснае дарослае жыццё, — канкрэтызавала Старшыня Савета Рэспублікі. — Для нас гэта сапраўднае свята, бо мы можам пагутарыць з хлопцамі і дзяўчатамі і ўбачыць, наколькі для іх гэтая падзея важная. Вельмі добрая традыцыя, якая склалася ў нашай краіне, і кожны раз з вялікай радасцю мы прымаем удзел у гэтай акцыі».

Спікер падкрэсліла, што ў Савет Рэспублікі прыехалі навучэнцы з усіх рэгіёнаў краіны, у тым ліку з невялікіх школ, дзе ў класах вучыцца ўсяго па некалькі чалавек. «Я ўяўляю, наколькі для іх важна прыехаць у горад Мінск, пабыць у Савеце Рэспублікі і ў іншых дзяржаўных органах, дзе адбываецца гэтая акцыя па ўручэнні пашпартоў, — заўважыла яна. — Вядома, гэта падзея ўсяго жыцця. Упэўнена, што яна застанецца ў жыцці маладога чалавека на доўгія гады. Мы са свайго боку імкнёмся данесці да хлопцаў і дзяўчат, наколькі важна, што яны з'яўляюцца грамадзянамі нашай краіны, наколькі важная іх грамадзянская пазіцыя ў адносінах да сваёй Радзімы, свайго народа, сваёй малой радзімы. Гэта заўсёды ўзаемазбагачальныя зносіны паміж дзецьмі і намі. Асабліва ў гэты год, калі мы адзначаем 30-годдзе Асноўнага Закона нашай краіны».

Вераніка КАНЮТА.

У тэму

Пасля цырымоніі ўручэння пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і дыялогу са Старшынёй Савета Рэспублікі школьнікі падзяліліся сваімі ўражаннямі.

Навучэнец Круговіцкай сярэдняй школы Ганцавіцкага раёна Матвей Валодзька сказаў, што яму вельмі прыемна атрымліваць галоўны дакумент у такой урачыстай абстаноўцы. «Думаю, гэты дзень запомню на ўсё жыццё, — адзначыў ён і падкрэсліў, што асабліва задавальненне атрымаў ад размовы з Наталляй Іванаўнай. — З атрыманнем пашпарта я буду адчуваць сябе сапраўдным грамадзянінам Рэспублікі Беларусь».

Вучаніца сярэдняй школы № 2 г. п. Смілавічы Яніна Сохар не хавае: той факт, што яна атрымае пашпарт з рук Старшыні Савета Рэспублікі, яе вельмі ўзрадаваў. Безумоўна, не абышлося без хвалявання. «Гэта вельмі знакавая падзея для мяне, — прызналася дзяўчына. — Я марыла сюды трапіць. Не думала, што атрымаецца так хутка. Гэты дзень назаўсёды застанецца ў маім сэрцы. Атрыманне пашпарта — новы крок у маім жыцці, калі ты ўжо не дзіця, але яшчэ і не дарослы чалавек».

Яніна расказала, што пасля заканчэння 9 класа плануе паступаць у сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову. Таму наяўнасць пашпарта мае вялікае значэнне. «Я паступлю на тую спецыяльнасць, якую хачу, каб у будучыні навучаць такіх жа юных грамадзян, як сама».

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Кітаі заявілі, што продажы ЗША ўзбраенняў Тайваню ператвараюць востраў у «парахавую бочку»

Продажы адміністрацыяй Злучаных Штатаў узбраенняў Тайваню ператвараюць востраў у «парахавую бочку», ставяць яго жыхароў перад сур'ёзнай пагрозай. Аб гэтым заявіў ТАСС прэс-сакратар кітайскага пасольства ў Вашынгтоне Лю Пэн'юй. «Продаж ЗША ўзбраенняў Тайваню з'яўляецца сур'ёзным парушэннем прынцыпу «аднаго Кітая» і трох сумесных камюніке Кітая і ЗША, асабліва камюніке ад 17 жніўня [1982 года]. Кітай рашуча выступае супраць такіх крокаў», — падкрэсліў дыпламат у адказ на просьбу пракаментаваць прадастаўленне Пентагонам кантракту на 250 мільёнаў долараў амерыканскай кампаніі General Atomics Aeronautical Systems (GA-ASI) на вытворчасць для Тайваня чатырох беспілотных лятальных апаратаў MQ-9B SkyGuardian, прызначаных для марской разведкі.

Банкі крыві ў Румыніі перапоўнены

Запасы крыві ў Румыніі дасягнулі новага максімуму дзякуючы значнаму павелічэнню кошту талонаў на харчаванне, якія выдаюцца донарам, паведаміў Euronews. У студзені цана ўзрасла з прыкладна 13 да 56 еўра за талон у эквіваленце. Цэнтры донарства цяпер увесь час перапоўненыя, і людзі перыядычна гадзінамі стаяць у чарзе, каб здаць кроў. Раней Румынія адчувала недахоп запасаў крыві, але цяпер яе банкі запоўніліся ўжо за першыя месяцы года. У краіне 42 донарскія пункты, міністэрства аховы здароўя нават разглядае магчымасць скарачэння іх колькасці.

На выставе ў Італіі скралі ўсе экспанаты, урон ацэньваецца ў мільён еўра

Дзясяткі работ італьянскага скульптара-абстракцыяніста XX стагоддзя Умберта Мастраяні, выстаўленыя ў колішняй рэзідэнцыі паэта Габрыэле д'Анунцыё, былі выкрадзены на мінулым тыдні, за дзень да закрыцця экспазіцыі. Зніклі залатыя статуэткі, пярсцёнкі, бранзалеты, брошкі, падвескі і іншыя адліваныя вырабы, створаныя па васковай мадэлі ў перыяд з 1950-х па 1990-я гады. Яны ацэньваюцца сама меней у адзін мільён еўра. Знакаміты скульптар быў дзядзькам легенды экрана Марчэла Мастраяні. Днямі работнікі музея выявілі, што выставачныя залы пустыя. Паведамляецца, што расследаванне вядзе спецпадраздзяленне карабінераў па ахове культурнай спадчыны.

І АХОВА, І ДЫЗАЙН...

Вызначаны на мясцовасці

Наша газета пастаянна сочыць за «крынічнай» справай і паспрыяла таму, што на яе звярнулі ўвагу. А рухавіком працэсу не адно дзесяцігоддзе з'яўляецца гродзенская экаактывістка заслужаны грамадскі эколаг Беларусі Тэрэза Белавусава. Дзякуючы яе намаганням, навуковым даследаванням і інфармацыйнай падтрымцы «Звязды» прыродныя крыніцы трапілі ў рэестр помнікаў прыроды мясцовага значэння. Прычым такі статус набылі адразу шэсць крыніц. Усе яны маюць свае назвы і знаходзяцца на тэрыторыі Гродзенскай пушчы.

Мне неаднойчы даводзілася бываць на гэтых аб'ектах: тады, калі сюды прыязджалі групы навукоўцаў інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі для лабараторных даследаванняў, і тады, калі рублівая Тэрэза Белавусава збірала валанцёраў на суботнік па ачыстцы тэрыторыі, і тады, калі тут сталі з'яўляцца першыя інфраструктурныя аб'екты ў выглядзе столікаў, лавак, навесаў і нават драўляных скульптур. Часткова работы фінансаваліся з фонду грамадзянскіх ініцыятыў, штосьці дапамаглі ўсталяваць лясгасы і сельскі Савет. Такім чынам, на сёння амаль усе крыніцы вызначаны на мясцовасці і маюць большменш прыдатны выгляд.

Погляд эксперта

На думку Тэрэзы Белавусавай, работа па добраўпарадкаванні крыніц павінна працягвацца. Да гэтага абавязвае іх новы ахоўны статус. Каб гэты працэс рухаўся хутчэй, яна імкнецца далучыць да справы аўтарытэтных грамадскіх экспертаў, прычым з выездам на месца. Гэтым разам такая паездка адбылася з удзелам Уладзіміра Капусціна, які шмат гадоў займаецца вывучэннем крыніц і сумесна з навуковадаследчым інстытутам водных праблем НАН Беларусі распрацаваў і выдаў метадычныя рэкамендацыі па рацыянальным выкарыстанні падземных вод, якія выходзяць на паверхню.

— Такая вада з'яўляецца важным стратэгічным аб'ектам. На выпадак засухі, прыродных ці тэхнічных катаклізмаў крыніца стане выратаваннем, гэта бяздонны фактар, а тэхнічныя збудаванні маюць аварыйнасць. І тады без пітной вады могуць застацца цэлыя населеныя пункты, — тлумачыць эксперт. — Таму ў гэтым кірунку распрацаваны рэкамендацыі, як аднаўляць крыніцы, як захоўваць і падтрымліваць на патрэбным узроўні якасць пітной вады і хто за яе нясе адказнасць. Гэта можа быць лясгас, сельскі Савет ці іншы землекарыстальнік тэрыторыі, дзе знаходзіцца крыніца. Такая важная пазіцыя замацавана і ў Водным кодэксе.

Дарэчы, эксперт стаў адным з арганізатараў першага ў Беларусі воднага форуму «Крыніцы Беларусі», які летась прайшоў у Мінску. На ім выступіла і Тэрэза Белавусава з прэзентацыяй гродзенскіх крыніц і з дзеянняў крынічнай вады. Яе даклад аказаўся настолькі цікавым, што арганізатары выказалі ідэю аб правядзенні наступнага форуму ў Гродне. Уладзімір Капусцін якраз і вырашыў ацаніць сітуацыю на месцы.

Не толькі зручна, але і прыгожа

І вось мы зноў накіроўваемся ў крынічны край. Дарога вядзе амаль да самай беларуска-літоўскай граніцы, гэта прыкладна 30 кіламетраў ад Гродна. Адсюль да літоўскага курорта Друскінінкай, які славіцца сваімі мінеральнымі водамі, менш за 10 кіламетраў. Першая па дарозе — крыніца Райгорад. Упершыню яна пазначана ў дакументах 1794 года. У той час Друскінінкай быў часткай Гродзенскай губерні.

Як паказалі лабараторныя даследаванні, вада тут таксама мае мінералізацыю. А яшчэ ў гэтых мясцінах праходзіць мелавы і крэмніевы шлейф, які стварыўся мільёны гадоў і ачышчае падземную ваду.

Раён таксама знакаміты. Літаральна каля крыніцы знаходзіцца Нёманская ўпадзіна, самае нізкае месца Беларусі — помнік прыроды рэспубліканскага значэння.

Ад дарогі сюды вядзе даволі шырокая сцежка. Відавочна, што месца добра вядомае ў акрузе. Вада выходзіць з металічнай трубы, якая ўкопана ў цэмент, і цячэ ўніз, у лясны масіў з той самай упадзінай. Прыгожае месца. Пры адпаведным падыходзе яно можа ўвайсці ў веламаршрут альбо стаць цікавым турыстычным пунктам. Гэтаму можа паспрыяць і невялікая гасцініца, якая знаходзіцца непадалёку. Праўда, пакуль яна не дзейнічае. Між тым удзельнік паездкі — грамадскі эколаг Яўген Філімонаў — звярнуў увагу на сляды мазуту непадалёку ад крыніцы. А такога не павінна быць, бо паліўныя рэчывы могуць трапіць у падземныя воды. Аўтатранспарту месца толькі на спецыяльных стаянках. Дарэчы, такая стаянка тут ёсць.

Менавіта крыніца «Райгорад» — першая ў чарзе на добраўпарадкаванне. І праект для яе гатовы. Праўда, пакуль толькі эскізны. Яго выканалі ў інстытуце «Гроднаграмадзянпраект». Тут ёсць драўляныя лаўкі, стэнды. Асноўны персанаж — жар-птушка як ахоўніца крыніцы. Цікавае праектнае рашэнне падтрымалі ў Міністэрстве прыроды. На думку Тэрэзы Белавусавай, гэта вельмі сучасная канцэпцыя, якая можа стаць прыкладам для крыніц Беларусі.

— Нядаўна з Мінпрыроды прыйшло пісьмо за подпісам намесніка міністра, дзе сказана аб падтрымцы ініцыятывы Гродзенскага творчага калектыву «Крыніца» па добраўпарадкаванні гідралагічнага помніка прыроды мясцовага значэння «Райгорад», — расказала гродзенская экаактывістка. — У пісьме пазначана, што рэжым аховы і выкарыстання ўскладаецца на Гродзенскі лясгас ва ўзаемадзеянні з усімі зацікаўленымі ведамствамі. Архітэктурны праект пастуліў у абласны камітэт прыродных рэсурсаў. Спадзяёмся, што прафесійныя эколагі будуць супрацоўнічаць з лясгасам. Мы са свайго боку падалі заяўку архітэктарам, каб складсці каштарыс праекта. Па папярэдніх даных, расцэнкі невялікія.

Звяртаецца ўвага на эстэтыку аб'екта, бо цяпер мала зрабіць зручна, трэба, каб было прыгожа і ўпісалася ў навакольле. Таму асноўны матэрыял — прыродны. Гэта драўляныя інсталяцыі з элементамі з камянёў.

Каб не дапусціць памылак

Пакуль самай добраўпарадкаванай можна лічыць крыніцу, якой займаецца Гожскі сельсавет. Тут асвоены сродкі конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў і самога сельсавета. Радуе вока навес з лаўкай, на якой сядзіць з кніжкай жанчына. Мяркуецца, што гэта гродзенская пісьменніца Эліза Ажэшка, якая прыязджала сюды па ваду. Дарэчы, яе імем названа і сама крыніца.

Непадалёку стаіць альтанка, дзе можна адпачыць і папіць вады. Зроблены насціл для падыходу да вады. Праўда, спадарожнікі звяртаюць увагу на асфальтаваны пад'езд да крыніцы. Недарэчнасць такога рашэння ў тым, што сцёкі з дарогі па схіле будуць паступаць якраз у крынічную ваду. Таму эксперты выказваюць прапанову, каб зрабіць кювет і пракласці моссцік. Ёсць неабходнасць у агароджы, і такое патрабаванне, на думку Уладзіміра Капусціна, варта выканаць на ўсіх крыніцах. Гэта акрэсліць ахоўную зону, якая мае свае нормы — 50 метраў ад рэчышча. Ад гэтага залежыць якасць вады, а пры шкодным уздзеянні яна не будзе доўга захоўвацца, пачне выпадаць асадак.

Свае рэкамендацыі эксперт-эколаг выказаў падчас сустрэчы з намеснікам старшыні Гродзенскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргеем Базарам.

— Важна зрабіць добраўпарадкаванне па адпаведных нормах і з улікам ландшафтных асаблівасцяў. Напрыклад, не варта рабіць стаянкі транспарту каля крыніцы, як мы назіралі. Альбо занадта блізка класці асфальт. Ахоўную зону трэба пазначыць агароджай, зрабіць адзін пешы і веласіпедны ўваход. Паставіць інфармацыйныя знакі, стэнды, малыя архітэктурныя формы. Кожная крыніца будзе мець сваю асаблівасць з улікам агульных патрабаванняў, — падкрэсліў Уладзімір Капусцін.

Прыродаахоўны камітэт гатовы падключыцца да гэтай справы і падтрымаць ініцыятыўных гродзенцаў. Бо такія аб'екты патрэбны людзям і яны павінны застацца. Сяргей Базар запэўніў, што ўжо сёлета можна пачаць работы па новым праекце. А на будучы год ёсць верагоднасць уключыць яго ў абласную праграму і атрымаць бюджэтнае фінансаванне. Сродкі будуць выдзяляцца землекарыстальнікам, якія адказваюць за стан аб'ектаў.

Тэрэза Белавусава прывяла прыклад такой сумеснай работы з Гродзенскім лясгасам. З іх дапамогай, а таксама з удзелам воінскіх часцей адноўлена лесвіца на крыніцы «Марыяна». Тут стаяць лаўкі, стол і крэслы з шырокіх дубовых спілаў. Неабходна замена трубы, па якой цячэ вада.

— Мы працуем над тым, каб для ўсіх крыніц быў тыпавы праект і ніхто не займаўся самадзейнасцю. Асноўныя рэкамендацыі павінны выконвацца, а архітэктурныя рашэнні могуць быць розныя. І гэта ўжо задача землекарыстальнікаў. А мы, грамадскія эколагі, паказалі, што ёсць такое багацце, — кажа Тэрэза Белавусава.

Сапраўды, крыніцы доўгі час былі, па сутнасці, безгаспадарчыя. І вось напрыканцы мінулага года шэсць крыніц Гродзенскага раёна аб'яўлены помнікамі прыроды мясцовага значэння. Цяпер усе яны маюць уласнікаў, у ліку якіх сельскі Савет, лясгас, райвыканкам і сельскагаспадарчае прадпрыемства. Менавіта для іх і рыхтуюцца праекты па добраўпарадкаванні крыніц.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

❍ У тэму

Нядаўна была даследавана яшчэ адна крыніца, якая знаходзіцца ў пасёлку Сапоцкін. Гэта побач з Аўгустоўскім каналам. Аб крыніцы паведаміў мясцовы жыхар. Пра просьбе Тэрэзы Белавусавай ваду даследавалі ў лабараторыі інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі. Такім чынам, было выяўлена, што па хімічным складзе вада ў пасёлку Сапоцкін Гродзенскага раёна «з'яўляецца гідракарбанатнай, магніева-кальцыевай і адпавядае біяхімічнаму тыпу прыродных вод, найбольш характэрных для паверхневых і прэсных падземных вод Беларусі». Па ўсіх вывучаных кампанентах хімічнага складу вада адпавядае нарматыўным якасцям пітной. Дарэчы, крыніца атрымала ўмоўную назву Сапоцкінскай і, магчыма, таксама мае сваю гісторыю, аб якой варта даведацца.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фінтэх

ВЫЙГРАЕ ТАННЫ І ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫ АРІП, НА СТАРЦЕ — МАСАВАЯ ТАКЕНІЗАЦЫЯ

На анлайн-канферэнцыі, прысвечанай будучыні плацежных тэхналогій у Беларусі, эксперты з розных сфер абмеркавалі, якія новаўвядзенні чакаюць рынак. Важнасць гэтай тэмы не абмяжоўваецца толькі прафесійнай супольнасцю. Яна таксама актуальная для спажыўцоў, якія імкнуцца да выкарыстання простых і надзейных плацежных інструментаў.

Канферэнцыя, дзе разглядалі інавацыйныя плацежныя рашэнні, сабрала больш за 1200 удзельнікаў, былі прадстаўлены ключавыя кірункі развіцця плацежных сістэм і касавай тэхнікі.

Сярод дакладчыкаў — не толькі вядучыя спецыялісты беларускага камерцыйнага сектара, але і прадстаўнікі дзяржаўнага або грамадскага сектара, такія як кіраўнік НКФА АРІП Наталля Васілеўская, дырэктар дэпартамента плацежных сістэм і лічбавых тэхналогій Нацыянальнага банка Таццяна Рускевіч і кіраўнік Асацыяцыі касавых апаратаў Уладзімір Паплаўскі.

Наталля Васілеўская звярнула ўвагу на перавагі выкарыстання АРІП для аплаты, падкрэсліўшы эканомію на транзакцыйных выдатках і больш нізкія камісіі ў параўнанні з традыцыйным эквайрынгам. Яна таксама прадставіла новы кампактны QR-тэрмінал, які дазволіць прадпрымальнікам прымаць безнаяўныя плацяжы з дапамогай QR-кодаў без спецыялізаванага банкаўскага абсталявання. Гэты тэрмінал можа быць інтэграваны з касавымі сістэмамі або выкарыстоўвацца аўтаномна для выстаўлення рахункаў праз асабісты кабінет або мабільны дадатак, звязаны з E-POS.

Іншая інавацыя — АРІП-дадатак для прыёму плацяжоў праз біяметрыю і QR-коды, які будзе цалкам функцыянальны пры актыўным удзеле банкаў у рэгістрацыі біяметрычных даных.

На думку Таццяны Рускевіч, такенізацыя ўяўляе сабой яшчэ адну перспектыўную тэхналогію для беларускага рынку, якая знаходзіць шырокае прымяненне ў сферы электроннай камерцыі.

Акрамя таго, дакладчыкі адзначылі, што з ліпеня 2025 года пачнуць дзейнічаць новыя нарматывы для касавага абсталявання, што запатрабуе адаптацыі бізнес-працэсаў і ўкаранення новых тэхналагічных рашэнняў. У прыватнасці, змены датычацца фарматаў касавых дакументаў і абавязацельстваў па ўліку маркіраваных тавараў, што цягне за сабой неабходнасць распрацоўкі спецыялізаваных сэрвісаў і праграмнага забеспячэння.

Эксперты фінансавых рынкаў адзначаюць, што плацежныя тэхналогіі для бізнесу будуць працягваць паляпшацца і станавіцца больш зручнымі і бяспечнымі. Праўда, любыя тэхналагічныя, а асабліва плацежныя рашэнні павінны быць зручнымі для карыстальніка і выгаднымі для бізнесу. Узгодненасць ва ўсіх удзельнікаў — галоўны прынцып у дадзеным выпадку. Напрыклад, у Беларусі вялікія перспектывы ў галіне сістэм імгненных плацяжоў для бізнесу. Менавіта такая сістэма можа істотна змяніць рынак.

Напрыклад, у Расіі малыя і сярэднія прадпрыемствы актыўна выкарыстоўваюць плацяжы па нумары тэлефона і QR-плацяжы сістэмы хуткіх плацяжоў (СХП). Для бізнесу гэта выгадна памерамі камісіі, таму ёсць зацікаўленасць у прасоўванні такіх рашэнняў. Больш сур'ёзны рытэйл ступіў далей і актыўна ўкараняе СХП. «На практыцы ў гандлі гэта выглядае так: пакупнікі паказваюць свой QR-код лаяльнасці, а мерчант (прадавец) ініцыіруе плацежнае рашэнне. Яшчэ адным перспектыўным кірункам для рынку Беларусі з'яўляецца такенізацыя. Напрыклад, такенізацыя плацежных карт — гэта і зручнасць, і павышаны ўзровень бяспекі ў «адным флаконе», — пракаментаваў перспектывы развіцця рынку Беларусі незалежны эксперт па міжбанкаўскай верыфікацыі і прадпрымальнік з больш чым 15-гадовым вопытам работы ў сферы сувязі, фінансаў і развіцця бізнесу Тарас Мяняйкін.

Сяргей КУРКАЧ.

Як ствараліся і змяняліся Канстытуцыі Савецкай Беларусі

АД «ДЫКТАТУРЫ ДА «КІРУЮЧАЙ

15 сакавіка мы будзем адзначаць 30-годдзе прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Асноўнага Закона нашай незалежнай краіны, які, уласна, і гарантуе яе суверэнітэт і незалежнасць. Згадваючы гэту найважнейшую для беларускай дзяржаўнасці дату, варта ўспомніць і пра «папярэднікаў» Канстытуцыі незалежнай Беларусі. Вядома, можна сягнуць далёка ў гісторыю, згадаўшы і Статуты ВКЛ, і Канстытуцыю Рэчы Паспалітай, па якіх калісьці жылі людзі на нашай зямлі. Але, улічваючы, што галоўныя дакументы найперш прапісваюць дзяржаўны лад і дзейнасць галоўных дзяржаўных інстытутаў, мы вырашылі засяродзіць увагу менавіта на тых, якія дэкларавалі БЕЛАРУСКУЮ дзяржаўнасць, якія пісаліся для дзяржаўнага ўтварэння, у самой назве якога прысутнічалі словы БЕЛАРУСЬ, БЕЛАРУСКАЯ...

Тыя, хто ведае гісторыю роднай краіны, ужо зразумелі, што з такім пасылам размова будзе весціся пра адносна невялікі адрэзак часу — нейкія сто з невялікім гадоў. (Дарэчы, сёлета яшчэ адна юбілейная дата — 105 гадоў з часу прыняцця першай БЕЛАРУСКАЙ Канстытуцыі.) Пасля было яшчэ тры... Пра тое, з чаго пачыналася, як трансфармаваўся Асноўны Закон беларусаў за час існавання сацыялістычнай рэспублікі, мы пагутарылі з Валянцінам МАЗЕЦАМ, кандыдатам гістарычных навук, вядучым навуковым супрацоўнікам аддзела найноўшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН.

— Валянцін Генрыхавіч, як вядома, прыняцце Канстытуцыі фактычна азначае пацвярджэнне існавання дзяржавы. Першая ўласна беларуская Канстытуцыя была прынята літаральна праз месяц пасля абвяшчэння ССРБ у пачатку 1919 года. Яе пісалі «з чыстага ліста» ці ўсё ж быў нейкі прыклад, нейкая аснова?

— Працэс стварэння беларускіх заканадаўчых актаў ішоў паралельна з працэсам фарміравання самой беларускай дзяржаўнасці. У аснову Канстытуцыі, прынятай 3 лютага 1919 года I Усебеларускім з'ездам Саветаў працоўных, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, быў пакладзены «Маніфест», абнародаваны 1 студзеня 1919 года Часовым рэвалюцыйным рабоча-сялянскім ўрадам Беларусі. І тут трэба адразу заўважыць, што суверэннасць Савецкай Беларусі, абвешчаная ў «Маніфесце», не азначала аслаблення сувязяў і адмены падпарадкавання РСФСР. «Маніфест» замацаваў характар узаемабаковых стасункаў паміж ССРБ і РСФСР. Адносіны гэтыя былі даволі трывалыя, Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі ў якасці афіцыйных прызнавала кіруючыя органы ўлады РСФСР. І адпаведна ў нашай першай Канстытуцыі многае было ўзята з Канстытуцыі РСФСР 1918 года. У ёй, як і ў расійскай, замацоўваліся палажэнні аб савецкай форме ўлады і дыктатуры пралетарыяту. Першай яе часткай стала ленінская Дэкларацыя правоў працоўнага і эксплуатуемага народа — своеасаблівая прэамбула, у якой абвяшчалася адмена прыватнай уласнасці на зямлю і нацыяналізацыя сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, замацоўвалася дзяржаўная ўласнасць на лясы, нетры, гаварылася аб увядзенні ўсеагульнай працоўнай павіннасці, стварэнні «Сацыялістычнай Чырвонай Арміі працоўных і сялян»...

— Што ж у ёй тады было ўласна беларускага?

— Галоўнае, што яна юрыдычна замацавала ўтварэнне новай савецкай дзяржавы і яе новую назву — Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі (ССРБ). Яна замацоўвала і асноўныя прынцыпы сацыялістычнага ладу, які толькі планавалася будаваць, — фактычна вызначала той шлях, па якім трэба было ісці навастворанай дзяржаве. У першым раздзеле гаварылася аб асноўнай задачы савецкай дзяржавы на пераходны перыяд — «усталяванне дыктатуры гарадскога і сельскага пралетарыяту і бяднейшага сялянства ў выглядзе магутнай Савецкай улады, у мэтах поўнага падаўлення буржуазіі, знішчэння эксплуатацыі чалавека чалавекам і ўсталявання сацыялізму, пры якім не будзе ні падзелу на класы, ні дзяржаўнай улады». Заўважце: «не будзе дзяржаўнай улады». Гэта калі будзе пабудаваны сацыялізм, а пакуль, у адпаведнасці з палажэннямі Канстытуцыі, улада ў ССРБ належала «ўсяму працоўнаму насельніцтву краіны, аб'ядналу ў гарадскіх і сельскіх Саветах». Органамі вярхоўнай улады аб'яўляўся з'езд Саветаў Беларусі, а ў перапынках паміж з'ездамі — Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ЦВК).

«Артыкул 12 абвясціў працу абавязкам усіх грамадзян рэспублікі, прычым рэгламентаваўся прынцып: «Хто не працуе, той не есць».

Абвяшчаліся ў асноўным толькі палітычныя свабоды — свабода слова і друку, свабода сходаў, мітынгаў, шэсцяў, а таксама свабода сумлення. Як было адзначана ў арт. 16, «кіруючыся інтарэсамі працоўнага класа ў цэлым, ССРБ пазбаўляе некаторых асоб і асобныя групы правоў, якія выкарыстоўваюцца імі на шкоду інтарэсам сацыялістычнай рэвалюцыі». Мелася на ўвазе, што «эксплуататары» паражаюцца ў правах: не маюць права ўдзелу ў выбарах, не прымаюцца на вайсковую службу. Абавязкаў грамадзян Канстытуцыя вызначала толькі два. Так, артыкул 12 абвясціў працу абавязкам усіх грамадзян рэспублікі, прычым рэгламентаваўся прынцып: «Хто не працуе, той не есць». Акрамя таго, усталёўваўся ўсеагульны воінскі абавязак, аднак са зброяй у руках мелі права абараняць рэвалюцыю толькі працоўныя, а на «непрацоўныя элементы» ўскладалася выкананне іншых вайсковых абавязкаў.

Вышэйшым органам улады ў рэспубліцы аб'яўляўся з'езд Саветаў Беларусі, а ў перапынках паміж з'ездамі — Цэнтральны Выканаўчы Камітэт ССРБ (ЦВК ССРБ). У склад выбранага на з'ездзе ЦВК БССР увайшло 50 чалавек. Апошні ўтвараў Малы і Вялікі Прэзідыум. Дакладнай рэгламентацыі — дзе заканадаўчая ўлада, дзе выканаўчая — не было, замацаванне прававога статусу гэтых органаў было даволі недакладным.

— Многае з таго, што вы зараз пералічылі, было, напэўна, узята з Канстытуцыі РСФСР...

— Многае, але не ўсё. Першая беларуская Канстытуцыя не прадугледжвала ўтварэння Савета народных камісараў (у адрозненне ад Канстытуцыі РСФСР), у ёй нічога не гаварылася аб мясцовых органах улады і кіравання і аб выбарчым праве. Заканадаўча, абвясціўшы ў першым раздзеле Канстытуцыі, што ўся ўлада ў ССРБ належыць гарадскім і сельскім Саветам, больш мясцовыя органы ўлады не згадваў. Парадак ажыццяўлення выбараў у органы

савецкай улады таксама не быў замацаваны. Лічылася, што з'яўляецца дастатковым урэгуляванне гэтых пытанняў Канстытуцыяй РСФСР. Увогуле схема пабудовы органаў улады і кіравання нагадвала абласную структуру.

Канстытуцыя ССРБ была кароткай, не ўключала многіх пытанняў, якія падлягаюць канстытуцыйнаму рэгуляванню. У ёй было толькі тры раздзелы, у той час як у Канстытуцыі РСФСР іх было шэсць...

— Нейкая заканадаўчая неахайнасць, калі можна так сказаць...

— Каб дзяржаве юрыдычна трывала замацавацца, патрэбныя як мінімум два складальнікі. Уласная армія і ўласныя грошы. Ні таго, ні другога ў ССРБ не было, таму і абапіраліся, і спадзяваліся на тых, у каго гэтыя складальнікі былі і з кім па дарозе ў пабудове сацыялізму — на РСФСР. Таму ў Канстытуцыі і гаварылася пра непарыўныя цесныя сувязі з Савецкай Расіяй.

— Тым не менш ужо на пачатку 20-х гадоў у Беларусі пачалося актыўнае менавіта дзяржаўнае будаўніцтва. А наступная беларуская Канстытуцыя была прынятая толькі ў 1927 годзе...

— Але ж у Канстытуцыю 1919-га ўносіліся значныя змяненні, якія дазволілі гэтаму дзяржаўнаму будаўніцтву развівацца. Пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад польскай акупацыі 31 ліпеня 1920 года прымаецца Дэкларацыя аб незалежнасці ССРБ. Такім чынам, ССРБ абвяшчаецца паўторна. І тады ўзнікла неабходнасць удакладніць палажэнні яе Канстытуцыі. На II з'ездзе Саветаў ССРБ, які адбыўся з 13 па 17 снежня 1920 года, былі прыняты дапаўненні да Канстытуцыі 1919-га.

«Быў створаны Савет Народных Камісараў — фактычна першы сапраўдны савецкі ўрад (не часовы, як урад Жылуновіча, і не не зусім зразумелы, як Вялікі Прэзідыум ЦВК). Дапаўненнямі рэгламентавалася стварэнне 15 наркаматаў (замежных спраў, ваенных спраў, унутраных спраў, асветы, харчавання, працы, аховы здароўя, земляробства, народнай сувязі, сацыяльнага забеспячэння, фінансаў, юстыцыі), прычым на правах наркаматаў былі Рабоча-сялянская інспекцыя і Надзвычайная камісія. Наркаматы ўзначальвалі народныя камісары, якія і ўваходзілі ў склад уладу Беларускай ССР».

Па сутнасці, з'езд абнавіў Канстытуцыю. Дакумент утрымліваў нормы аб структуры і паўнамоцтвах цэнтральных органаў савецкай улады ССРБ. Быў створаны Савет Народных Камісараў — фактычна першы сапраўдны савецкі ўрад (не часовы, як урад Жылуновіча, і не не зусім зразумелы, як Вялікі Прэзідыум ЦВК). Дапаўненнямі рэгламентавалася стварэнне 15 наркаматаў (замежных спраў, ваенных спраў, унутраных спраў, асветы, харчавання, працы, аховы здароўя, земляробства, народнай сувязі, сацыяльнага забеспячэння, фінансаў, юстыцыі), прычым на правах наркаматаў былі Рабоча-сялянская інспекцыя і Надзвычайная камісія. Наркаматы ўзначальвалі народныя камісары, якія і ўваходзілі ў склад уладу Беларускай ССР. З'езд Саветаў, згодна з дапаўненнямі, выбіраў ЦВК Беларусі ў складзе 60 чалавек, які з'яўляўся паміж з'ездамі Саветаў вышэйшым заканадаўчым, распарадчым і кантрольным органам ССРБ. Прэзідыум ЦВК Беларусі выбіраўся сесіяй ЦВК у складзе старшыні і чатырох членаў, да якога ў перыяд паміж сесіямі ЦВК пераходзяць функцыі і правы ЦВК. Аднак агульнапалітычныя пытанні вялікай важнасці ўносіліся на зацвярджэнне сесіі ЦВК... Гэта ўжо была даволі дэталёва выбудаваная сістэма кіравання, самастойная, якая не абапіралася на нейкую іншую звонку.

— А тэрытарыяльныя змяненні былі неяк зафіксаваныя ў Канстытуцыі? Рыжскі дагавор, уступленне ў склад СССР, узбуйненні 1924 і 1926 года павінны ж былі адлюстравацца ў Асноўным Законе...

— Ужо ў новай Канстытуцыі, прынятай у красавіку 1927 года, былі адлюстраваныя гэтыя працэсы. Акрамя, бадай, вынікаў Рыжскага дагавора, таму што Беларусь не была суб'ектам яго падпісання і ўдзельніцай перагавораў. Праца над новай Канстытуцыяй вялася фактычна з 1924 года, пасля прыняцця Канстытуцыі СССР. Гэта быў складаны і працяглы працэс. Але затое Канстытуцыя, зацверджаная VIII Усебеларускім з'ездам Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў 11 красавіка 1927 года, была больш распрацаванай і дасканалай у параўнанні з папярэдняй, Асноўным Законам рэспублікі ў поўным сэнсе гэтага слова, з ахопам усіх найважнейшых пытанняў дзяржаўнага ладу. У ёй быў замацаваны факт уваходжання БССР у склад Саюза ССР з правам свабоднага выхаду, канчаткова замацаваны і ўсталяваны сувязі БССР з Саюзам ССР і іншымі саюзнымі рэспублікамі, былі вызначаны суверэнныя правы рэспублікі самастойна прымаць сваю Канстытуцыю, уносіць у яе адпаведныя змены, стварацъ вышэйшыя органы дзяржавы і кіравання, вызначацъ адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел... Што датычыцца выбарчага права, то Канстытуцыя пазбаўляла значную частку грамадзян Беларускай ССР выбарчых правоў. Апрача таго, выбары праводзіліся на агульных сходах па прадпрыемствах, былі шматступеньчатымі, а галасаванне было адкрытым. Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты праводзілася толькі па дырэктывах партыйнага кіраўніцтва КП(б) Беларусі, што адпавядала палажэнням аб «дыктатуры пралетарыяту» і сведчыла аб значным абмежаванні дэмакратыі.

У Канстытуцыі абвяшчалася аб роўнасці правоў усіх грамадзян незалежна ад іх расавай і нацыянальнай прыналежнасці (аднак гэта не вызначала магчымасць пазбаўлення асобных грамадзян і асобных груп грамадзян правоў, якімі яны карыстаюцца). На першым плане ў ёй былі правы працоўных, а не чалавека, БССР па-ранейшаму абвяшчалася ў якасці сацыялістычнай дзяржавы і дыктатуры пралетарыяту, якая ажыццяўляе свае задачы на аснове саюза рабочых і сялян.

Абвяшчалася роўнасць чатырох моў — беларускай, рускай, польскай і ідыш. Найбольш значныя заканадаўчыя акты павінны былі друкавацца на гэтых чатырох мовах, нават сама Канстытуцыя была

ПРАЛЕТАРЫЯТУ» СІЛЫ КПБ»

выдадзена ў чатырох варыянтах. Але ў сувязі з тым што значная большасць насельніцтва БССР належала да беларускай нацыянальнасці, беларуская мова прызначалася як мова, «пераважная для ўзаемаадносін паміж дзяржаўнымі, прафесіянальнымі і грамадскімі ўстановамі і арганізацыямі».

— Вы заўважылі, што вынікі Рыжскага міру, які па жывым падзяліў Беларусь папалам, ніяк не фіксаваліся ў Асноўным Законе. А мне здаецца, тое, што Мінск (ці тады — Менск) быў у Канстытуцыі вызначаны сталіцай, адлюстроўвала, дэкларавала жаданне і мэту вярнуць спрадвечныя беларускія тэрыторыі, каб сталіца апынулася ў цэнтры рэспублікі, а не на заходняй мяжы...

— Так, вы маеце рацыю. Увогуле аб Канстытуцыі 1927 года стваралася ўражанне, што беларускі народ атрымаў нарэшце поўную самастойнасць у справах будавання сваёй дзяржавы. Аднак пры павышэнні ўвагі да нацыянальнага пытання гэты дакумент не закранаў элементаў, што датычыліся б паняццяў «народ», «нацыя» і «дзяржаўнасць».

— У Канстытуцыі 1937 года таксама аб гэтым размовы не было. Але ў паліталогіі яна, як і Канстытуцыя СССР 1936-га, лічыцца адной з самых дэмакратычных...

— У Канстытуцыі БССР, прынятай на надзвычайным XII З'ездзе Саветаў БССР 19 лютага 1937 года абвяшчалася, што ўся ўлада ў БССР належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Саветаў дэпутатаў працоўных, але найбольш важныя пытанні дзяржаўнага жыцця былі аднесены да кампетэнцыі СССР. Істотным чынам мянялася выбарчая сістэма. Абвяшчалася, што выбары дэпутатаў ва ўсе Саветы дэпутатаў працоўных (Вярхоўны Савет БССР, акруговыя, раённыя парады дэпутатаў і г. д.) ажыццяўляюцца на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. Заўважце, ужо не было выключэнняў, мелі права галасаваць усе. Арганізацыя вышэйшых органаў дзяржаўнай улады зведала значныя змены. Спыніла існаванне сістэма з'ездаў Саветаў. Заканадаўчая ўлада стала належаць новаму заканадаўчаму органу — Вярхоўнаму Савету БССР. Ён працаваў у сесійным парадку і не з'яўляўся пастаянна дзеючым органам. Сесіі склікаліся два разы на год. Пастаянна дзеючым вышэйшым органам дзяржаўнай улады стаў Прэзідыум Вярхоўнага Савета.

Пра дыктатуру пралетарыяту не згадвалася, але адзначалася, што БССР — сацыялістычная дзяржава. Такім чынам, сацыяльная база Саветаў пашыралася. Гэтым і іншымі палажэннямі была рэгламентавана больш жорсткая цэнтралізацыя грамадска-палітычнага жыцця. Упершыню былі ўведзены палітычная і эканамічная асновы БССР: першую складалі Саветы дэпутатаў працоўных, другую — сацыялістычная сістэма гаспадаркі і сацыялістычная ўласнасць на сродкі вытворчасці. Былі замацаваны дзве формы ўласнасці: дзяржаўная і калгасна-кааператыўная. У ранг канстытуцыйнага права быў уведзены дзяржаўны народнагаспадарчы план. Чатыры раздзелы Канстытуцыі рэгламентавалі працэдуру стварэння і дзейнасць вышэйшых і мясцовых органаў улады і кіравання, рэгулявалі адносіны паміж БССР і СССР, сцвярджалі нязменнасць меж без волі рэспублікі, магчымасць уступаць у непасрэдныя адносіны з замежнымі краінамі, абменьвацца дыпламатычнымі і консульскімі прадстаўнікамі, ствараць свае рэспубліканскія ваенныя фарміраванні, нават выйсці са складу СССР... Па сутнасці, сапраўды ўсё даволі дэмакратычна. Прынамсі, так дэкларавалася...

«Спыніла існаванне сістэма з'ездаў Саветаў. Заканадаўчая ўлада стала належаць новаму заканадаўчаму органу — Вярхоўнаму Савету БССР. Ён працаваў у сесійным парадку і не з'яўляўся пастаянна дзеючым органам. Сесіі склікаліся два разы на год. Пастаянна дзеючым вышэйшым органам дзяржаўнай улады стаў Прэзідыум Вярхоўнага Савета».

— І гэта Канстытуцыя — самы «доўгажыхар», па ёй рэспубліка жыла больш за сорак гадоў...

— У яе ўносіліся адпаведныя змяненні і дапаўненні ў 1939 годзе пасля далучэння Заходняй Беларусі, а таксама ў 1946 годзе, пасля таго як БССР стала адным з заснавальнікаў ААН, калі СНК замяніў Савет Міністраў. Але асноўныя пастулаты Асноўнага Закона 1937 года захаваліся. Больш за тое, Канстытуцыя, прынятая на нечарговай дзявятай сесіі Вярхоўнага Савета БССР дзявятага склікання 14 красавіка 1978 года, была першая з такой прыгожай прэамбулай: «Народ Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, кіруючыся ідэямі навуковага камунізму, усведамляючы сябе неад'емнай часткай усяго савецкага народа, захоўваючы пераемнасць канстытуцыйнага развіцця нашай краіны, ідэй і прынцыпаў Канстытуцыі Беларускай ССР 1919 года, Канстытуцыі Беларускай ССР 1927 года, Канстытуцыі Беларускай ССР 1937 года і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй (Асноўным Законам) Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, якая замацавала асновы грамадскага ладу і палітыкі СССР, устанавіла правы, свабоды і абавязкі грамадзян, прынцыпы арганізацыі і мэты сацыялістычнай агульнанароднай дзяржавы, прымае і абвяшчае гэту Канстытуцыю…»

Прынцыповае адрозненне Канстытуцыі 1978 года ў тым, што ў ёй нарэшце была юрыдычна афармленая «кіруючая і накіроўваючая сіла савецкага грамадства, яго палітычнай сістэмы» — КПСС і Камуністычная партыя Беларусі як яе аддзяленне ў Беларусі. Усё грамадскае і дзяржаўнае жыццё было падпарадкавана інтарэсам камуністычнага будаўніцтва. Так, згодна з артыкулам 44, гарантавалася нават свабода навуковай, тэхнічнай і мастацкай творчасці... калі гэта адпавядала мэтам камуністычнага будаўніцтва.

Зрэшты, усё гэта было толькі дэкларавана. Ва ўсе часы важна не толькі тое, што ў Асноўным Законе краіне дэкларуецца, але і як гэта грамадзянамі і дзяржавай выконваецца.

Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ.

АСНОВА ГРАМАДЗЯНСКАЙ ЗГОДЫ І НАРОДНАГА АДЗІНСТВА

Дата 15 сакавіка мае гістарычнае значэнне для беларускага грамадства і дзяржавы. У гэты дзень спаўняецца 30 гадоў Канстытуцыі Беларусі, якая адлюстравала маральны, палітычны ўзровень грамадства, яго асноўныя ідэі канца XX стагоддзя, увасобіла ў сабе сацыяльныя ідэалы народа. У ёй вызначана мадэль сучаснай беларускай дзяржавы, якая грунтуецца на волі народа, выказвае волю народа і функцыянуе ў інтарэсах народа. Гэты канстытуцыйны арыенцір абавязвае дзяржаўныя органы, службовых асоб, грамадска-палітычныя інстытуты ў сваёй стваральнай дзейнасці зыходзіць з волі народа і дзейнічаць на карысць народа, усяляк садзейнічаючы дасягненню найважнейшых канстытуцыйных мэт: забеспячэнню міру і грамадзянскай згоды, дабрабыту грамадзян, непахіснасці народаўладдзя, незалежнасці і працвітання Рэспублікі Беларусь.

Згода ва ўсе часы лічылася важнай каштоўнасцю грамадства, бо ад яе залежалі дабрабыт, а часам і лёс яго членаў. Сёння грамадзянская згода мае значэнне канстытуцыйнай каштоўнасці. Яна непасрэдна замацавана ў прэамбуле Канстытуцыі Беларусі і ў артыкуле 89[1] у якасці адной з канстытуцыйных функцый Усебеларускага народнага сходу — вышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя Рэспублікі Беларусь. На неабходнасць канстытуцыйна-прававога захавання і ўмацавання грамадзянскай згоды паказвае Канцэпцыя прававой палітыкі Рэспублікі Беларусь (пункт 41.3), зацверджаная Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2023 года № 196.

Грамадзянская згода ў сціснутым, канцэнтраваным выглядзе знаходзіць выражэнне, замацаванне ў Канстытуцыі Беларусі ў якасці каштоўнасцяў, прынцыпаў і палажэнняў. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь адкрываецца словамі: «Мы, народ Рэспублікі Беларусь (Беларусі)...», сведчачы пра дзве найважнейшыя цесна ўзаемазвязаныя канстытуцыйныя каштоўнасці, якія прадвызначаюць у выніку гэтага ўзаемадзеяння народа і дзяржавы. Калектыўнае «мы», якое вынікае з адзінай супольнасці «народ Рэспублікі Беларусь», увасабляе нашу калектыўную ідэнтычнасць, народнае адзінства. Народ як носьбіт суверэнітэту і першасны суб'ект канстытуцыйных праваадносін уяўляе сабой дзяржаўна-прававую супольнасць людзей, якія жывуць у дзяржаве і падпарадкаваны адпаведным законам. Ён выступае ў якасці арганічнага цэлага, а яго воля не з'яўляецца сукупнасцю волі выбаршчыкаў або насельніцтва. Наша дзяржава, упершыню абвешчаная ў 1994 годзе на канстытуцыйным узроўні як сацыяльная і прававая, ёсць абсалютна прававая мэта — каштоўнасць грамадства і яго членаў.

Узаемная канстытуцыйная адказнасць асобы і дзяржавы за грамадскае і дзяржаўнае развіццё паказвае на неабходнасць узаемадзеяння паміж імі, прадугледжвае грамадзянскую згоду.

Праз грамадзянскую згоду ва ўзаемасувязі з формамі ідэнтычнасці члены грамадзянскай супольнасці, яе інстытутаў у працэсе дыялогу па пытаннях грамадскага жыцця, удзелу ў кіраванні справамі грамадства і дзяржавы, вырашэнні дзяржаўных спраў набываюць народнае (грамадзянскае) адзінства, сведчаннем якога з'явілася актыўнасць выбаршчыкаў (больш за 73 %) пры прывядзенні 25 лютага адзінага дня галасавання па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў дэпутатаў. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка ў Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 31 сакавіка 2023 года звярнуў увагу на важнасць народнага адзінства як першай умовы суверэнітэту і незалежнасці і захавання роднай мовы, памяці аб нашай гераічнай гісторыі.

Узаемная канстытуцыйная адказнасць асобы і дзяржавы за грамадскае і дзяржаўнае развіццё паказвае на неабходнасць узаемадзеяння паміж імі, прадугледжвае грамадзянскую згоду.

Важна адзначыць, што на канстытуцыйным узроўні Прэзідэнт увасабляе адзінства народа (частка другая артыкула 79), якое знаходзіць выражэнне не толькі ў змешчаных у прэамбуле Канстытуцыі і іншых яе палажэннях (аб агульнасці культурных і духоўных традыцый, кірунках развіцця беларускай дзяржаўнасці), але і ў шэрагу артыкулаў, якія вызначаюць мэты і задачы Рэспублікі Беларусь, крыніцу дзяржаўнай улады, узаемную адказнасць грамадзяніна і дзяржавы, чалавека і грамадства (частка першая артыкула 1, частка другая артыкула 2, частка першая артыкула 3, частка трэцяя артыкула 23 і інш.).

Членаў грамадзянскай супольнасці аб'ядноўваюць родная мова, тэрыторыя, гістарычная памяць, нацыянальная прыналежнасць, агульныя мэты, задачы, інтарэсы, палітычныя, навуковыя, рэлігійныя перакананні, імкненні, што забяспечвае іх адзінства. Грамадзянскае адзінства знаходзіць выражэнне ў канстытуцыйных формах абавязку, у якіх адлюстроўваюцца абумоўленыя сацыяльнай неабходнасцю, задачамі грамадскага развіцця патрабаванні і маральныя заклікі грамадства і дзяржавы, адрасаваныя чалавеку і грамадзяніну. З прычыны дагаворнага характару Канстытуцыі выкананне канстытуцыйнага абавязку, які раўнамерна распаўсюджваецца на ўсіх, мае важнае значэнне для жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы.

Згода ва ўсе часы лічылася важнай каштоўнасцю грамадства, бо ад яе залежалі дабрабыт, а часам і лёс яго членаў. Сёння грамадзянская згода мае значэнне канстытуцыйнай каштоўнасці.

2024 год, аб'яўлены Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 лістапада 2023-га Годам якасці ў мэтах фарміравання ў грамадстве адказнасці за вынікі сваёй работы і адчування датычнасці да будучыні краіны, будзе садзейнічаць умацаванню сацыяльнай згуртаванасці, народнага адзінства.

Народнае адзінства — важны прыярытэт ідэалогіі беларускай дзяржавы, заснаванай на канстытуцыйных і традыцыйных каштоўнасцях нашага грамадства. Паспяховае сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі, як сведчаць яе дасягненні ў многіх галінах жыццядзейнасці, магчымае толькі ва ўмовах грамадзянскай згоды і народнага адзінства.

Анатоль ЦІКАВЕНКА, суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
на строительство объекта

«Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями общественного назначения по ул. Жуковского и наземным паркингом со встроенными помещениями общественного назначения» (2 пусковой комплекс)

ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ

Застройщик: ОАО «Минский домостроительный комбинат» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей решением Мингорисполкома 14 февраля 2001 г. за № 100258980.

Юридический (почтовый) адрес: 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43, телефоны для справок: (017) 395 48 60, (017) 360 58 64, +375 44 777 11 58.

Прием заявлений и заключение договора: понедельник-четверг с 8.15–16.30, обед с 12.00–12.45, пятница с 8.15–15.00, обед с 12.00–12.45.

В течение трех предшествующих лет ОАО «Минский домостроительный комбинат» в качестве Застройщика (заказчика) построены следующие объекты: «Многоквартирный жилой дом в границах ул. Шаранговича – ул. Панченко – МКАД» – ноябрь 2022 г.;

«Многоквартирный жилой дом в районе улиц Серова, Любанской № 36 по детальному плану» – декабрь 2022 г.;

«Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными объектами торгово-общественного назначения по ул. Купревича», 1-й пусковой комплекс – март 2023 г.;

«Многоквартирный жилой дом на территории жилого района Сокол в границах ул. Барамзиной – ул. Березогорской – ул. Киреева со встроенной медицинской амбулаторией в г. Минске» – октябрь 2023.

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА

Проект разработан УП «Проектное управление» ОАО «Минскпромстрой»

Результат государственной экспертизы проектной документации:

Заключение государственной экспертизы (положительное) № 486-15/19 от 14.10.2019;

Заключение государственной экспертизы (положительное) № 213-15/20 от 21.05.2020;

Заключение государственной экспертизы (положительное) № 609-15/22 от 04.10.2022.

Земельный участок предоставлен для строительства объекта решением Мингорисполкома «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства» от 13.02.2020 г. № 408. Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации земельного участка от 10 марта 2020 года № 500/1805-1721.

Извещение о получении уведомления и регистрации объекта строительства Инспекции Госстройнадзора по г. Минску от 17 октября 2019 г. № 03/447. Объект зарегистрирован 17 октября 2019 года под № 2-204Ч-070/19.

Заказчиком и генеральным подрядчиком по строительству объекта выступает ОАО «Минский домостроительный комбинат».

СВЕДЕНИЯ ОБ ЭТАПАХ СТРОИТЕЛЬСТВА И СРОКАХ ЕГО РЕАЛИЗАЦИИ

Начало строительства – октябрь 2019 г.

Срок ввода объекта в эксплуатацию – март 2024 г.

Проектируемый объект расположен в Октябрьском административном районе г. Минска.

Участок объекта ограничен с севера-востока и юга улицами Быховская, Жуковского и Сенницкая – соответственно.

На земельном участке запроектирован наземный паркинг на 300 машино-мест со встроенными торгово-административными помещениями на 1-м этаже.

Здание паркинга – пятиэтажное, открытого типа, со встроенными помещениями административно-торгового назначения, эксплуатируемой кровлей (над частью здания) с размещением машино-мест.

Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас. Наружные стены первого этажа – из монолитного железобетона и керамических блоков с утеплением снаружи по типу легкой штукатурной системы.

Во встроенных административно-торговых помещениях финишная отделка поверхностей стен, потолков и полов проектом не предусматривается.

По настоящей проектной декларации предлагается для граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц для заключения договора создания объекта долевого строительства **встроенное помещение, расположенное на 1-м этаже наземного паркинга:** административно-торговое помещение № 8 общей площадью 694,74 кв. м.

Стоимость 1 кв. м общей площади встроенного помещения составляет **3600,00** рублей (с НДС).

Оплата первоначального взноса в размере 80 % от цены договора осуществляется в течение 7-ми календарных дней с даты регистрации договора в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома, остальная сумма вносится согласно графику платежей до 01.05.2024.

Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве

Принятие и регистрация заявлений потенциальных дольщиков о заключении договоров, заключение договоров создания объектов долевого строительства осуществляются группой долевого строительства ОАО «Минский домостроительный комбинат» (каб. 304Б) с 20 марта 2024 года, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43, понедельник-четверг с 8.00 до 16.00, пятница – с 8.00 до 15.00, обед с 12.00 до 12.30.

Для подачи заявления гражданину необходимо – личное присутствие, гражданский паспорт, юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю – документы, подтверждающие государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, юридического лица, документ, удостоверяющий личность гражданина – индивидуального предпринимателя, представителя или должностного лица, документ, подтверждающий полномочия на подписание заказа на выполнение работ (доверенность, приказ, решение, иной документ).

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

«Жилая многоквартирная застройка с объектами общественного назначения на пересечении пр-та Дзержинского и ул. Щорса в г. Минске» (2-й очереди строительства и 3-й очереди строительства), (3-я очередь строительства, 3-й пусковой комплекс) и (3-я очередь строительства, 2-й пусковой комплекс)

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «ГрандХаузИнжиниринг», зарегистрировано Минским горисполкомом 28.09.2017 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192975600.

Местонахождение: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 19, пом. 872.

Тел.: 8017-236-26-34; 8017-236-27-55; +375 29-340-52-52; +375 33-340-52-52;

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник-пятница с 9.00 до 19.00, суббота с 10.00 до 15.00,(по записи), выходной день – воскресенье.

Цель строительства – строительство объекта «Жилая многоквартирная застройка с объектами общественного назначения на пересечении пр-та Дзержинского и ул. Щорса в г. Минске».

В объекте : **«Жилая многоквартирная застройка с объектами общественного назначения на пересечении пр-та Дзержинского и ул. Щорса в г. Минске» (2-й очереди строительства и 3-й очереди строительства), (3-я очередь строительства) выделены следующие пусковые комплексы:**

***3-й пусковой комплекс*:** 19-этажный четырехсекционный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения № 2 по г. п. и здание № 7.

Начало строительства 3-й очереди 3-го пускового комплекса (№ 2 по г. п., № 7 по г. п.) – 01.03.2024 г., продолжительность строительства составляет – 23,5 месяц. Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – 17.02.2026 г.

2-й пусковой комплекс: многоуровневая надземная гараж-стоянка на 300 м/м (№ 8 по генплану).

Начало строительства 3-й очереди 2-го пускового комплекса (№ 8 по г. п.) – 17.12.2023 г., продолжительность строительства составляет – 17,5 месяца. Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – 01.06.2025 г.

Застройщиком получены документы:

- решения Минского городского исполнительного комитета от 09.09.2021 № 2681;

- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка: № 500/2036-837 от 01.06.2023, № 500/2036-835 от 01.06.2023;

- проектной документации, прошедшей в установленном порядке государственную экспертизу (заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 01.11.2022 № 643-15/22);

- извещения о получении уведомления и регистрации объекта строительства, выданного Инспекцией контроля и надзора за строительством по г. Минску от 02.11.2021 № 2-203Ж-039/21;

- договора генерального строительного подряда № 05/06Г-3 от 05.06.2023, генеральный подрядчик СООО «СтройМонолит».

Информация об объекте:

Объект строительства расположен на пересечении пр-та Дзержинского и ул. Щорса в г. Минске.

В жилом доме № 2 по генплану 355 квартир со встроенными помещениями общественного назначения на 1-м этаже и со встроенно-пристроенными помещениями торговым центром № 7 по ГП.

В жилом доме № 2 по генплану:

- однокомнатные квартиры площадью 42–74 кв. м, стоимостью от 1200–1600 долл. США;

- двухкомнатные квартиры площадью 60–100 кв. м, стоимостью от 1200–1600 долл. США.

В многоуровневой надземной гараж-стоянке расположено 300 м/м (№ 8 по генплану):

- стоимость квадратного метра машино-места от 350 долл. США до 1200 долл. США, площадью от 13 до 20 кв. м.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади и условий оплаты строящегося жилого дома.

Условия оплаты: 100 % оплата полной стоимости объекта долевого строительства в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора долевого строительства в местном исполнительном органе. **Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату зачисления на р/с Застройщика.**

Порядок ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства: ознакомление дольщиков с объектом строительства, с планировками квартир, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется по предварительной договоренности в рабочее время ООО ««ГрандХаузИнжиниринг» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 19, пом. 872, тел.: 8017 236-26-34; 8017 236-27-55; +375 29-340-52-52; +375 33-340-52-52.

Информацию об объекте, планы квартир и нежилых помещений смотрите также на сайте организации ООО ««ГрандХаузИнжиниринг» www.grushevka.by

Извещение о проведении повторных публичных электронных торгов (аукциона) по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк БелВЭБ».

Ранее извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 24.02.2024 в газете «Звязда» № 39 (30173), стр. 3

Аукцион состоится **26.03.2024,** начало: **10.00,** окончание: **16.00** на электронной торговой площадке (далее – ЭТП) iintorgi.by. Время приема заявок: **с 14.03.2024 09.00 до 25.03.2024 г. 16.00**

Организатор аукциона:
ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

Продавец: ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

Лот № 1: капитальное строение с инв. № 330/С-33528,
расположенное по адресу: г. Мозырь, ул. Саета Г.Е., 4. Общая площадь: 738,7 кв. м.
Наименование: здание банка. Назначение: здание специализированное финансового назначения.

Начальная цена с учетом НДС 20 % – 789 756,70 бел. руб.

Размер задатка – 10 % от начальной цены лота. Шаг торгов – 5 % от начальной цены лота.

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия и порядок проведения аукциона, информация об имуществе размещены на официальном сайте ЭТП «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by.

Задаток перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа ООО «Индустрия Инноваций»

Контакты: тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 27 марта 2024 года открытого повторного аукциона с понижением на 20 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
- Изолированное помещение с инв. № 320/D-34606 общей площадью 2986,1 кв. м, наименование: изолированное помещение № 3; назначение: производственное помещение, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-3. **- Изолированное помещение с инв. № 320/D-34608 общей площадью 3020,3 кв. м,** наименование: изолированное помещение № 4; назначение: складское помещение, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-4. **- Изолированное помещение с инв. № 320/D-34609 общей площадью 894,4 кв. м,** наименование: изолированное помещение № 5; назначение: складское помещение, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-5. **- Капитальное строение, инв. № 320/С-40378 общей площадью 780,4 кв. м,** наименование: участок автодорог для обслуживания помещений ГПК, назначение: сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, составные части и принадлежности: А – Автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием, Б – Автодороги, въезды с бетонным покрытием, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1, участок 4. Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером 321850100003009697 площадью 0,2012 га. **- Капитальное строение, инв. № 320/С-40379 общей площадью 577,1 кв. м,** наименование: участок автодорог для обслуживания помещений ГПК, назначение: сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, составные части и принадлежности: А – Автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием, Б – Автодороги, въезды с бетонным покрытием, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1, участок 5. Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером 321850100003009698 площадью 0,1531 га. Емкость для латекса (инв. № 142-6030); емкость для латекса (инв. № 142-6031); емкость для латекса (инв. № 142-6032); емкость для латекса (инв. № 142-6033); емкость для латекса (инв. № 142-6034); емкость для латекса (инв. № 142-6035); емкость для латекса (инв. № 142-6036); емкость для латекса (инв. № 142-6037); емкость для латекса (инв. № 142-6038, 1980 года выпуска); ограждение промплощадки 36,30 п. м (9 плит) (инв. 120-2019-8); ограждение промплощадки 56,70 п. м (14 плит) (инв. 120-2019-7); шпалы железобетонные б/у, 4 штуки (инв. № 9993312727); шпалы деревянные б/у, 207 (инв. № 9993312728); рельсы Р-65 б/у, 247, 54 метра (инв. 9993317675)	**1 711 272,41**	171 127,24

Продавец: ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин. 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (044) 797-88-07, заместитель директора по техническим вопросам – Галактионов Виктор Владимирович.

Шаг аукционных торгов – 5 %.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** р/с BY76BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 14 марта 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 25 марта 2024 г. в 16.00 включительно.

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату за услуги (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 08.02.2024 г. № 27 (30161).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Информация об аукционе размещена на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by** в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (044) 599-18-16

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
14 САКАВІКА 2024 г.
ЧАЦВЕР
№ 5 (15973)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

«МУЗЫКА З МАЙГО ЖЫЦЦЯ ДАКЛАДНА НЕ СЫДЗЕ, Я ЖЫВУ ЁЙ»



Крыху больш за месяц таму прайшоў суперфінал самага маштабнага музыкальнага тэлешоу краіны «Фактар.by». Пераможцам стаў 19-гадовы студэнт Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Данііл Савеня. Сціплы, далікатны, таленавіты юнак са Случчыны, нягледзячы на пэўную асаблівасць — адсутнасць зроку, — змог дастойна прайсці шлях на праекце і здабыць, напэўна, галоўнае — любоў і падтрымку гледачоў. Карэспандэнт «Чырвонай змены» пагутарыла з Данііламі пра яго дзяцінства, шлях да музыкі, атмасферу на «Фактар.by», а таксама даведалася, як спявак адносіцца да папулярнасці, якая прыйшла да яго падчас удзелу ў тэлешоу.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Час маладых

На парозе сталення

Усебеларуская акцыя «Мы — грамадзяне Беларусі!», прысвечаная Дню Канстытуцыі, стартавала днямі ў Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь. У яе рамках да 15 сакавіка пройдзе шэраг мерапрыемстваў ва ўсіх рэгіёнах краіны. Толькі па лініі БРСМ адбудзецца 197 урачыстасцяў з удзелам 3920 юных грамадзян, якія дасягнулі пэўных поспехаў у вучобе, спорце ці грамадскай дзейнасці.

На ўрачыстым мерапрыемстве 14-гадовыя юнакі і дзяўчаты з усёй краіны атрымалі свой першы пашпарт з рук **Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь заслужанага юрыста Беларусі Пятра Міклашэвіча і першага сакратара ЦК БРСМ Аляксандра ЛУК'ЯНАВА.**

— Увесь мінулы перыяд з дня прыняцця Канстытуцыі і да гэтага часу наша краіна ўстойліва развіваецца на канстытуцыйнай аснове як дэмакратычная, сацыяльна-прававая дзяржава, у якой чалавек, яго правы і свабоды з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы, — заявіў на акцыі Старшыня Канстытуцыйнага Суда Пётр Міклашэвіч.

Перспектывы для даследчыкаў і вучоных

Адкрыты прыём работ на Конкурс маладых міжнароднікаў СНД імя А. А. Грамыкі. У ім могуць паўдзельнічаць студэнты і выпускнікі ўстаноў вышэйшай адукацыі, аспіранты, вучоныя, выкладчыкі, журналісты, аналітыкі, спецыялісты сферы бізнесу, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, дыпламанты дзяржаў — удзельніц СНД ва ўзросце да 40 гадоў.

Заявіць пра сябе можна ў асноўнай і дэбютнай (узрост да 30 гадоў) намінацыях, а таксама ў намінацыі «Конкурс эсэ». Да разгляду прымаюцца арыгінальныя неапублікаваныя навуковыя артыкулы і аналітычныя запіскі, напісаныя адным ці некалькімі аўтарамі памерам не больш за 30 тысяч знакаў. Для даследавання прапаноўваецца шэраг тэм, як, напрыклад, «Перспектывы інтэграцыйных праектаў на постсавецкай прасторы...», «Контуры новага светапарадку: выклікі і магчымасці для Расіі і краін СНД», «Вялікая Айчынная вайна і Другая сусветная вайна: праблема захавання гістарычнай памяці і барацьба з фальсіфікацыяй гісторыі» і іншыя. А што датычыцца намінацыі публіцыстычных эсэ, то тут паразважаць можна пра: «Новая мяжа міру: вайна цывілізацый ці баланс макрарэгіёнаў?», «Культурныя войны»: як барацьба за перафарматаванне ідэнтычнасці чалавека ўплывае на сусветную палітыку?»

Падаць заяўку (анкета ўдзельніка і конкурсная работа) можна да 23.59 13 мая 2024 года праз электронную форму на афіцыйным сайце конкурсу konkurs-gromyko.org.

У БДУ з'явіцца новая спецыяльнасць

У новым навучальным 2024/2025 годзе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце на факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі адкрыецца новая спецыяльнасць з прысваеннем трайной кваліфікацыі «Краіназнаўства і перакладчыцкая дзейнасць», пра што паведамляецца на сайце ВНУ.

Набор будзе здзяйсняцца на першую ступень вышэйшай адукацыі на бюджэтную і платную формы навучання. Адкрыццё такой спецыяльнасці абумоўлена запатрабаванасцю сярод беларускіх арганізацый у канкурэнтных і ўніверсальных супрацоўніках, якія будуць мець комплексныя веды ў галіне эканамічных, палітычных, сацыякультурных, этнічных асаблівасцяў развіцця розных краін, а таксама валодаць замежнай мовай і з навыкамі як у педагагічнай, так і вытворчай дзейнасці.

Для паступлення абітурыентам патрэбна будзе здаць цэнтралізаваны экзамен альбо прайсці цэнтралізаванае тэсціраванне па трох прадметах: матэматыцы, геаграфіі, беларускай альбо рускай мове. Асвойваць новую спецыяльнасць студэнты будуць 4,5 года. На выхадзе выпускнікі атрымаюць трайную кваліфікацыю «Географ. Выкладчык. Перакладчык», дзякуючы чаму змогуць знайсці работу ў якасці выкладчыкаў, перакладчыкаў у профільных арганізацыях і на вытворчасці, у турыстычных, рэкламных, ІТ-кампаніях, а таксама выкладчыцкіх і даследчыцкіх арганізацыях.

Фестываль

Б'ецца сэрца моладзі свету

Сусветны фестываль моладзі прайшоў з 1 да 7 сакавіка на федэральнай тэрыторыі “Сірыус”. Ад паўночнага рэгіёна ў Сочы адправіліся каля 60 чалавек. Сёлета аднымі з галоўных тэм фестывалю сталі адзінства нацый, адказнасць за лёс свету, захаванне сямейных каштоўнасцяў. Моладзь Віцебшчыны, як і іншых удзельнікаў фестывалю, чакала насычаная, цікавая праграма: дыскусіі, лекцыі, выставы, спартыўныя спаборніцтвы і сумесныя трэніроўкі, добраахвотніцкія акцыі, майстар-класы, сустрэчы з кіназоркамі і многае іншае.

Усяго фестываль аб'яднаў каля 20 тысяч маладых людзей са 180 краін свету. Адпраўляючы дэлегацыю Віцебшчыны, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама Марына Навіцкая падкрэсліла, што ў лік дэлегатаў прысутныя маладыя людзі трапілі не выпадкова – гэта моладзь з актыўнай жыццёвай і грамадзянскай пазіцыяй, патрыёты сваёй Радзімы, кожны ярка і неардынарна праявіў сябе ў студэнцкім або прафесійным жыцці.

Беларускія дэлегаты з дэвізам “Беларусь. Моладзь. Будучыня” ўдзельнічалі ў прававым марафоне, дзелавой гульні, фестывалі вулічнага мастацтва (гэта новая форма), выставе “Самая прыгожая краіна”, актыўна прадстаўлялі “сінявокую” на іншых пляцоўках. Дарэчы, беларуская дэлегацыя была адной з самых маштабных – каля 630 чалавек і, як адзначылі самі ўдзельнікі і арганізатары, самай арганізаванай.

Кіраўнік дэлегацыі Віцебскай вобласці на Сусветным фестывалі моладзі ў Сочы, намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, па справах моладзі, рэлігій і нацыянальнасцяў галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Ірына Сафейчанка падзялілася сваімі ўражаннямі аб гэтым незабыўным тыдні. «Вялікі дзякуй арганізатарам, якія змаглі стварыць святочны настрой адразу па прыездзе. Выдатна адпрацавалі валанцёры, за кожнай групай моладзі былі замацаваны аташэ, якія дапамагалі арыентавацца на пляцоўках на тэрыторыі Сірыуса, у аэрапорце, на адкрытых пляцоўках, у кампусах, дзе праходзілі адукацыйныя, культурныя, творчыя мерапрыемствы. Вельмі ўразіла тая атмасфера, якая панавала на тэрыторыі фестывалю: калі сустракаліся з прадстаўнікамі розных народаў, то абдымаліся, распавядалі пра сваю краіну, дарылі падарункі, запрашалі ў госці. На закрыцці фестывалю прысутнічаў Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін, на многіх пляцоўках выступалі вядучыя палітыкі: Дзмітрый Мядзведзеў, Сяргей Лаўроў і іншыя, а таксама артысты, рэжысёры, навукоўцы. Гэта дазволіла моладзі не толькі атрымаць адказы на свае пытанні, але і набыць добрую тэарэтычную базу, на практыцы пратэставаць усе распрацоўкі, прыняць удзел у квізах».

Асабліва ўразілі дэлегатаў паўночнага рэгіёна зарадка і прабежка разам з алімпійскімі чэмпіёнамі, удзел у касцюміраваным шэсці моладзі свету, падчас якога кожная дэлегацыя спявала на сваёй роднай мове. На прадстаўнікоў педагагічнай галіны важнае ўражанне зрабіла наведванне тэхнапарка, дзе яны маглі задаць любое пытанне лічбавым аватарам Аляксандра Пушкіна, Льва Талстога і Фёдара Дастаеўскага.

На адкрыцці Сусветнага фестывалю моладзі таксама перад удзельнікамі выступілі вядомы расійскі бітбоксер Вахтанг Каландадзэ, акцёр Канстанцін Хабенскі, расійская спявачка Паліна Гагарына. У аснову яркага імерсіўнага шоу лягла ідэя аб тым, наколькі важна маладым людзям ставіць перад сабой высокую планку і рухацца да сваёй мары. Дарэчы, за сем дзён фестывалю на 55 пляцоўках прайшлі 800 мерапрыемстваў.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота ТК «Віцебская вобласць. Афіцыйна».

Убачыць галоўнае



НЕ БЕЛАЯ ВАРОНА, А ЦУДОЎНЫ ЛЕБЕДЗЬ

Гісторыя дзяўчыны, якая даведалася, што з'яўляецца альбіносам, толькі ў дванаццаць гадоў

Белыя валасы, бясколерныя вейкі, бледная скура — вось адметныя рысы альбіносаў. Дваццацівасьмігадовая Кацярына ЦІМАШЭНКА са Жлобіна не па чутках ведае, як гэта — быць выдатным лебедзем, нават калі часам на цябе глядзяць, нібы на белую варону. А пра тое, як прыняць сябе, якія плюсы ёсць у альбінізме, з якімі цяжкасцямі даводзіцца сутыкацца з-за такой асаблівасці, мы даведаліся ў нашай гераіні.

— Мае бацькі думалі, што я звычайнае дзіця, проста з вельмі светлай скурай. У той час не шмат інфармацыі было пра альбіносаў, таму мама даведалася пра тэрмін «альбінізм» і яго наяўнасць у мяне толькі тады, калі мне афіцыйна паставілі такі дыягназ пасля генетычнага тэста ў Гомелі. Аднак тое ніяк не паўплывала на маё шчаслівае дзяцінства. Цяжкасці ўзнікалі хіба што падчас паездак з сям'ёй на мора. Я не магла цэлы дзень знаходзіцца на пляжы, купацца і хадзіць кудысьці, заўсёды трэба было намазвацца крэмам, абнаўляць яго, плаваць у адзенні...

У падлеткавым узросце наша гераіня сутыкнулася з праблемай выбудоўвання кантакту з аднагодкамі. Гадоў з адзінаццаці-дванаццаці пачалі з'яўляцца негатыўныя каментарыі ў бок Кацярыны. Яна прызнаецца, што ўжо не жадае ўспамінаць тыя словы.

— Разам з праявамі булінгу ў падлеткавым узросце я на ўсё жыццё запомню словы аднаго хлопца. Аднойчы мяне абразілі мае аднагодкі, і ён сказаў ім: «Яна вырасце і стане выдатным лебедзем, за якім вы яшчэ будзеце бегаць, сціраючы свае ногі і аббіваючы парогі яе дома». Так і здарылася, бо пасля тыя людзі хацелі быць са мной побач.

Прыняць сябе і сваю ўнікальную знешнасць Кацярына не магла дастаткова доўга. Пачынаючы са школьных часоў яна фарбавала вейкі і бровы. Працягвалася гэта прыкладна да трэцяга курса медыцынскага ўніверсітэта.

— Мне даводзілася ўставаць вельмі рана, каб паспець нафарбавацца перад парамі. Праз першыя два месяцы вучобы ва ўніверсітэце мая сяброўка, а тады яшчэ аднагрупніца, якая фарбавалася ў блонд, прызналася мне, што ўвесь гэты час назірала за мной і чакала, калі ж у мяне ўжо адрастуць карані валасоў. Яна думала, быццам я іх фарбую, уяўляеце? І толькі праз два месяцы цесных зносін зразумела, што я альбінос. Настолькі добра я «маскіравалася» *(смяецца)*.

Сям'я і блізкія людзі нашай гераіні не падтрымлівалі яе імкнення наносіць на сябе ўвесь час макіяж і пастаянна казалі ёй: «Каця, ты і так цудоўная!» Але дзяўчына ў гэта не верыла і працягвала «хаваць» сваю знешнасць пад касметыкай.

— Прыняць саму сябе мне дапамагла выпадковая сустрэча з фатографам на вяселлі маёй сястры. Яму спадабалася мая знешнасць (дарэчы, я была нафарбаваная), і ён запрасіў мяне на здымку. З задавальненнем прыняла прапанову і перад здымкай пазнаёмілася з візажыстам, якая аказалася вельмі мілай дзяўчынай і проста не стамляючыся паўтарала, наколькі я прыгожая і ўнікальная без касметыкі. І яна прапанавала мне зрабіць яшчэ адну фотасесію з іншым фатографам, але ўжо без макіяжу. Тады я нават адрошчвала бровы, каб яны былі майго белага колеру, і вынік адназначна быў таго варты. Класныя фатаграфіі і прыняцце сябе — што можа быць лепш?!

Пасля гэтай гісторыі Кацярына спрабавала сябе ў ролі мадэлі, і гэта, безумоўна, ёй спадабалася. Дзяўчыне прыходзіла шмат прапаноў, але з-за невысокага росту яна не змагла гэтым займацца на прафесійным узроўні. Цяпер Каця здымаецца значна менш, а большую частку часу аддае свайму прафесійнаму блогу.

— Калі я жыла ў маленькім горадзе і была школьніцай, можна сказаць, у мяне «тыкалі пальцам». У Мінску таксама шмат людзей абарочваліся на мяне, глядзелі ўслед, і я была нібы ў цырку, толькі не ў ролі гледача. Звяртаюць увагу і цяпер. Напрыклад, калі была ў Барысаве на адпрацоўцы, я выйшла ў краму, і мужчына, гледзячы прама на мяне і паказваючы сваёй жонцы, сказаў: «Ого, паглядзі, якая белая». Мне нават давялося зрабіць яму заўвагу. А мая сяброўка, гуляючы са мной, заўсёды жартам кажа: «Цікава, на нас усе глядзяць, таму што ты белая ці я прыгожая?»

Альбіносы паміраюць у 30 гадоў. Гэта, напэўна, самая шакавальная памылка, якую чула наша гераіня. Такая сяэраднестатыстычная лічба ўзнікла з-за таго, што большасць альбіносаў нараджаюцца ў афрыканскіх краінах. А там яны да гэтага часу лічацца магічнымі істотамі, якіх могуць забіць. І таму сярэдняя працягласць жыцця альбіносаў вельмі малая.

— Мне пашанцавала, бо вялікіх праблем са здароўем, у прыватнасці са зрокам, як у іншых альбіносаў, не маю. Я паступіла ў медыцынскі, стала стаматолагам і нават здала на правы. У мяне першапачаткова быў вельмі добры зрок, але падчас вучобы ён пачаў падаць з-за нагрузкі. Адзінае, што мяне непакоіць, маё вочнае дно не ўтрымоўвае пігмента, таму вочы не абаронены. Па-добраму на вуліцы мне трэба заўсёды насіць сонцаахоўныя акуляры, але я гэта раблю толькі пры яркім сонцы, у снегапад альбо ў моцны туман. Ёсць яшчэ адна праблема (яна існуе ва ўсіх альбіносаў) — гэта вітамін D. Мы не можам доўга знаходзіцца на сонцы, таму гэты вітамін не засвойваецца. А паколькі не так даўно была даказаная яго эфектыўнасць, нам трэба ўвесь час яго дадаткова прымаць. Ну і загар — балючая тэма. Круглы год я карыстаюся крэмамі з SPF. Абгараю я вельмі хутка. Хапае 30 хвілін на сонцы — і я ўжо чырвоная. Адзін раз нават быў выпадак, калі мы з сябрамі нядоўга пабылі на возеры, а пазней у мяне паднялася тэмпература пад 40 і з'явіліся пухіры на спіне.

Нягледзячы на сваю незвычайную знешнасць, наша гераіня ў першую чаргу цудоўная дзяўчына. І, вядома ж, эксперыменты са знешнасцю не абышлі яе бокам. На адным модным паказе ёй затаніравалі валасы рыжавым колерам. Абяцалі, што той хутка вымыецца, але пігмент сыходзіў з валасоў доўга, і нават прыйшлося вымываць яго ў салоне. Таму той, хто думае, што на альбіносах не трымаецца фарбавальнік, памыляецца.

— Альбіносы, як кітайцы, усе на адзін твар. Але гэта нават не памылка, а чалавечая бестактоўнасць. Часта здаралася такое, што фатографу для здымкі патрэбен быў альбінос. У Мінску ёсць некалькі чалавек з такой генетычнай асаблівасцю. І вось калі адзін не згаджаўся, то запрашалі іншага. Значыць ім без розніцы, які ў мяне тыпаж, вобраз і што я за чалавек. Для іх мы ўсе, нібы на адзін твар. Мне гэта вельмі не падабаецца, бо кожны з нас — асоба са сваёй гісторыяй. І ўвогуле кожны чалавек індывідуальны. Галоўнае — памятаць пра гэта, прымаць і любіць сябе такім, які ты ёсць.

Ангеліна НОВІКАВА.
Фота з архіва гераіні.

СВЯТА ГРАЦЫІ І НАТХНЕННЯ

Пакуль вясна яшчэ не напоўніцу радуе нас цяплом, яркімі фарбамі і эмоцыямі, а значыць, шукаць іх можна ў нашых фотарэпартажах. Нагоды для гэтага заўсёды знойдуцца. Напрыклад, у першы тыдзень сакавіка сваіх каралеў прыгажосці вызначалі адразу ў дзвюх сталічных ВНУ — Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце і ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце.

На конкурсе грацыі і артыстычнага майстэрства «Міс БДЭУ — 2024» карону пераможцы прымерала студэнтка ўлікова-эканамічнага факультэта Велорыя Яўменава. А ўвогуле за званне найлепшай прыгажуні змагаліся дзесяць прэтэндэнтак, па прадстаўніцы ад факультэта. Шлях да перамогі праходзіў у некалькі этапаў: пралогавае дэфіле, відэавізітоўка і прамоўніцкае майстэрства, народнае дэфіле, конкурс творчых нумароў і жаночае дэфіле.

А вось конкурс грацыі і артыстычнага майстэрства «Міс МДЛУ — 2024» даў магчымасць студэнткам-удзельніцам праявіць сябе ў навуцы, спорце, валанцёрстве і творчасці. У зале, напоўненай усмешкамі і святлом сонцень вачэй, за галоўны тытул змагаліся восем прэтэндэнтак. У пагоні за адпаведнасцю ідэалу ні адна з дзяўчат не забыла аб прыгажосці душы, думак і сэрца. І кожны конкурс быў пацвярджэннем гэтага. Напрыклад, на конкурсе прамоўніцкага майстэрства студэнткі давалі характарыстыку якасцям чалавека альбо прэзентавалі гледачам свае творчыя нумары. Яркім завяршэннем конкурснай праграмы стала дэфіле ў вясельных сукенках. Перамогу ў намінацыі «Міс натхненне» і тытул «Міс МДЛУ — 2024» прысудзілі Аліне Субоце. Пазней дзяўчына падзялілася:

«Стаць удзельніцай конкурсу грацыі і артыстычнага майстэрства «Міс МДЛУ» было маёй марай з першага курса. І сёння я яе здзейсніла. На працягу пяці гадоў актыўна выступаю на сцэне нашага ўніверсітэта ў якасці вядучай, а вось роля канкурсанткі стала для мяне чымсьці новым і хвалюючым. На працягу месяца мы кожны дзень рэпеціравалі. Гэта быў доўгі і працаёмкі шлях, але мы справіліся. Цяпер магу сказаць толькі адно: я бязмежна шчаслівая!»

Віншуем пераможцаў і жадаем змяняць сваёй прыгажосцю, крэатыўнасцю і шчырасцю свет да лепшага, а таксама скарыць яшчэ безліч новых вяршынь!

Фота Лізаветы ГОЛАД і Віктара ІВАНЧЫКАВА.

«МУЗЫКА З МАЙГО ЖЫЦЦЯ ДАКЛАДНА НЕ СЫДЗЕ, Я ЖЫВУ ЁЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Данііл, раскажыце, якім было ваша дзяцінства?

— У тры месяцы мне паставілі цяжкі дыягназ з-за праблем са зрокам. Гэтую хваробу нельга вылечыць, таму я сляпы амаль з самага нараджэння. Я ніколі не бачыў і ўвогуле не магу ўявіць, напрыклад, як выглядае чорны або белы колеры. Нягледзячы на такую асаблівасць, калі мяне папрасілі б апісаць сваё дзяцінства, я шчыра адказаў бы, што яно было паўнавартасным. У прынцыпе па аповедах маці я заўсёды быў досыць актыўным, непаслухмяным і дапытлівым дзіцём, шмат чым цікавіўся.

— Хто запрыкмеціў ваш інтарэс да музыкі?

— Мае вакальныя здольнасці першым заўважыў педагог музычнага гуртка, які я наведваў у дзіцячым садку. Мяне часта запрашалі выступаць на ранішніках. А каля пяці гадоў, зусім яшчэ дзіцем, я трапіў, можна сказаць, на сваю першую вялікую сцэну, калі выступаў на фестывалі мастацкай творчасці «Вясёлкавы карагод», які праходзіў у Маладзечне.

Потым сямігадовы Данііл Савеня паступіў у Маладзечанскую агульнаадукацыйную школу-інтэрнат для дзяцей з парушэннем зроку, дзе правучыўся дзевяць гадоў. Там, па яго словах, і пачалося станаўленне зусім юнага Данікаартыста, а вакальныя здольнасці пачалі раскрывацца дзякуючы кіраўніку музычнага гуртка Таццяне Уілсан.

— Чым вам запомніліся школьныя гады?

— З цяплом успамінаю гэты перыяд, але не магу сказаць, што я надта моцна любіў вучыцца. Нягледзячы на тое, за дзевяць гадоў адкрыў для сябе шмат усяго новага. Напрыклад, засвоіў работу за камп'ютарам, а гэта, як вы разумееце, не так проста было зрабіць. Я, дарэчы, шмат ад каго чую, што дарослыя людзі хочуць вярнуцца ў школьныя гады, але мне бліжэй іншы падыход: люблю паступова рухацца наперад.

Я быў вельмі актыўным вучнем, пастаянна ўдзельнічаў у школьных творчых мерапрыемствах, шмат займаўся музыкай. У 5 класе прыйшло разуменне, што трэба мяняць методыку работы, бо пачалася мутацыя голасу. У сувязі з гэтым мы звярнуліся па дапамогу да педагога па вакале Алены Атрашкевіч, з якой пазнаёміліся на конкурсе юных выканаўцаў эстраднай песні «Маладзічок» у 2015 годзе. Там яна, напэўна, і заўважыла мой патэнцыял. І, як бачыце, усё нездарма, ужо больш за восем гадоў працуем разам.

— Ці можна сказаць, што талент да спеваў перадаўся вам ад родных?

— Сапраўды, у мяне ўсе члены сям'і добра спяваюць: дзядзька быў удзельнікам самадзейнага ансамбля, тата таксама валодае пэўнымі вакальнымі здольнасцямі, і сястра малодшая.

— Данііл, а як лічыце, музыка з вамі назаўсёды?

— У падлеткавым узросце я нават не здагадваўся, што буду займацца музыкай настолькі прафесійна. Шчыра кажучы, сур'ёзна аб гэтым задумаўся толькі ў 8 класе, калі надыходзіў час выбіраць прафесію. Тады мой педагог па вакале Алена Атрашкевіч прапанавала паспрабаваць паступіць у Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў, у якім яна і цяпер працуе, каб мы маглі больш часу ўдзяляць музычным заняткам і каб я атрымліваў тую спецыяльнасць, да якой ляжыць душа. І цяпер я разумею, што зрабіў правільны выбар, таму што вучоба ў каледжы — велізарная база навыкаў, ведаў, знаёмстваў і рэсурсаў.

Пра сваю будучыню я неаднаразова размаўляў і са сваёй сям'ёй. Мама і бабуля казалі, што мне трэба працягваць займацца музыкай і ўвогуле не бачылі мяне ў нейкай іншай сферы дзейнасці. Безумоўна, калі я захацеў бы цалкам змяніць сваё жыццё і заняцца справай, ніяк не звязанай з творчасцю, сям'я прыняла б маё рашэнне. Але мне было б складана гэта зрабіць, таму што я і сам адчуваю, што музыка са мной назаўсёды.



У маім жыцці быў такі перыяд, калі спрабаваў уладкавацца на працу, якая не была звязана з музыкай. Я шукаў рабочае месца, таму што хацеў адчуць сябе самастойным і занятым, як кажуць, сур'ёзнымі карыснымі справамі. Крыху пазней зразумеў, што музыка — гэта таксама адказна і значна. Не заракаюся, у жыцці ўсякае можа здарыцца: сёння ты запатрабаваны артыст, а заўтра — не. І калі так абдумаецца, то я, упэўнены, знайду сабе прымяненне. У любым выпадку дзе б я ні быў, музыка з майго жыцця дакладна не сыдзе, я жыву ёй.

— А як у ваша жыццё прыйшоў «Фактар.by»?

— Думкі наконт удзелу ў гэтым тэлешоу ў нас з педагогам Аленай Атрашкевіч узніклі пасля завявання Гран-пры на Нацыянальным конкурсе маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні. Цяпер я гляджу на гэта так: у мяне з'явілася магчымасць праявіць сябе — я яе выкарыстаў.

— Вы прайшлі доўгі шлях у праекце: ад адпраўлення відэавізітоўкі да песні-пераможцы. Раскажыце, чым вам запомніўся ўдзел у «Фактар.by»?

— Калі казаць пра кастынгі і этап «крэслы», то падчас іх я фактычна атмасферу тэлешоу яшчэ не адчуў. А вось на прамых эфірах сапраўды прыйшло ўсведамленне, што стаў удзельнікам самага маштабнага музычнага праекта краіны. Падчас здымак інтэрв'ю, візітовак я пачаў прывыкаць да тых, хто са мной працуе, да тэхнічнага абсталявання, да атмасферы «Фактар.by».

— Ці моцна хваляваліся перад суперфіналам?

— З большага ўся гэта гісторыя пра хваляванне, на мой погляд, — візуальнае адчуванне. Я практычна ўвесь час да пачатку здымак праводзіў у грымёрцы, рэдка выходзіў на грым або даць інтэрв'ю журналістам, таму хвалявання асабліва не адчуваў.

— Ці марылі вы аб перамозе?

— Пра перамогу я стараўся не думаць нават на суперфінале, бо гэта вельмі збівае з толку. На мой погляд, сапраўдны артыст павінен усведамляць, што на сцэне працуе для людзей, а не для сябе і рэалізацыі сваіх амбіцый. Калі ўвесь час думаць пра перамогу, можа ўзнікнуць нездаровая канкурэнцыя, а вось думкі кшталту «Я павінен быць першым» — увогуле не мая гісторыя. На кожным з этапаў праекта я думаў пра тое, што магу не прайсці далей. Мне ўвогуле ўласціва рыхтавацца да горшага, каб было прасцей прымаць паражэнне.

— Раскажыце пра свайго настаўніка Сярогу...

— Ён вельмі глыбокі, удумлівы і канкрэтны чалавек, і за гэта я яго моцна паважаю. У большасці выпадкаў мой настаўнік гаварыў выключна грунтоўна. А яшчэ Сяргей Васільевіч вельмі ўважлівы да дэталяў. Калі і ўзнікалі некаторыя праблемы падчас здымак, то, дзякуючы яму, яны максімальна хутка вырашаліся. Яшчэ для яго было важна маё самаадчуванне. Мы шмат гаварылі пра ператамленне, якое магло пагоршыць вынік. Ён аднойчы сказаў: «Табе не трэба рвацца цяпер» і меў рацыю. Калі б не Сяргей Васільевіч, магчыма, гэтай перамогі і не здарылася б.

— Чаго вы чакалі ад удзелу ў праекце і што ўдалося рэалізаваць?

— Адназначна хацеў паспрабаваць сябе ў прамых эфірах. А яшчэ на ўсіх канцэртах я звычайна працую ў адным і тым жа касцюме, а тут была магчымасць прымераць на сябе розныя вобразы. І мне гэты вопыт спадабаўся.

— Ці пагадзіцеся вы з тым, што да вас прыйшла папулярнасць пасля ўдзелу ў тэлешоу?

— Так, мяне пачалі пазнаваць пасля прамых эфіраў. Але я для сябе вырашыў, што папулярнасць у шырокім сэнсе слова гэта не зусім тое, што мне патрэбна. Хутчэй за ўсё, паспяховым артыстам я буду лічыць сябе тады, калі мае песні будзе слухаць тая аўдыторыя, якая разумее, што хачу данесці сваёй творчасцю.

— А што наконт хейтэраў?

— Нянавісці ці зайздрасці ў рэальным жыцці не адчуваў ніколі, а вось у сацыяльных сетках гэтага хапае. Вядома, я ўсе каментарыі чытаю, таму што мне цікава, што людзі насамрэч думаюць пра мяне і маю творчасць. Але стаўлюся да іх спакойна, адзінае, з-за гэтага вельмі перажывае мама.

